## Жураўлі вярнуліся. Зімы не будзе?

**На Брэстчыне заўважаны першыя народы жураўлёў, якія вярнуліся з цёплых краёў.**

Шэрыя птахі з курлыканием ляцелі над Брэстам 11 студзеня. А на наступны дзень над горадам праляталі белалобыя гусі. У Палескім аграрна-экалагічным інстытуце НАН Беларусі адзначылі, што ў сярэдзіне студзеня ў наш рэгіён вярнуліся многія пералётныя птушкі. Пары сокала-пустальгі, напрыклад, прыляцелі ў гнёзды і пачалі такаваць. Птушкі пераблыталі поры года. І тэта не вельмі добра. Спецыялісты адзначаюць, што ў выпадку надыходу маразоў яны пададуцца на палі, напрыклад, за азімым рапсам, будуць знішчаць і іншыя культуры. Ну а калі зіма па-сапраўднаму пачне паказваць нораў, птушкі будуць вымушаныя зноў адлятаць у цяплейшыя мясціны, што стане для іх дадатковым выпрабаваннем.

Бывалі выпадкі, калі жураўлі прыляталі на Брэстчыну ў сярэдзіне лютага, а вось каб у студзені...

Можа, і праўда зімы не будзе, яны ж умеюць адчуваць тэта лепш за нас?

Святлана ЯСКЕВІЧ

**Источник:** Звязда. – 2020. – № 9. – С. 3.